# Два яблыкі на адной галінцы

**І. М. Ткачова,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
гімназіі г. Быхава

2022 год з'яўляецца юбілейным для песняроў беларускага народа, класікаў нацыянальнай літаратуры Янкі Купалы і Якуба Коласа. У 1882 годзе з розніцай у чатыры месяцы ў свет прыйшлі дзве постаці, а на небасхіле заззялі дзве найярчэйшыя зоркі беларускай літаратуры, каб апавясціць усяму свету, што ёсць такі народ, што ёсць такая мова. І па сённяшні дзень мы вымаўляем іх імёны разам. Яны ніколі не аддзялялі сябе ад народа, а былі з ім адзіным цэлым, нават псеўданімы сабе ўзялі з народнага жыцця і фальклору.

Уявіце сабе, што ад вёскі Акінчыцы да мястэчка Вязынка сучасным транспартам можна дабрацца за 1 гадзіну і 20 хвілін. А вось Якубу Коласу і Янку Купалу сустрэцца суджана было толькі праз 30 гадоў. Між іншым, сяброўства абодвух паэтаў таксама цягнулася 30 гадоў. Пры гэтым завочна яны ўжо 5 гадоў былі знаёмы, бо першыя вершы Янкі Купалы рэдагаваў менавіта Якуб Колас, калі працаваў у рэдакцыі газеты "Наша Ніва" ў 1907 годзе. Тады яны прыходзілі за подпісам Янук Купала. І толькі ў 1912 годзе адбылася першая сустрэча паэтаў. Жыў тады Якуб Колас непадалёку ад вёскі Мікалаеўшчына. І вось аднойчы ён вырашае паслаць Янку Купалу ліст і запрасіць да сябе ў госці, а маршрут апісвае сам. Янка Купала паехаў спачатку цягніком да Стаўбцоў, затым пайшоў пешшу праз лес, ішоў уздоўж берага Нёмана. Сустрэча была доўгачаканая і цёплая. З гэтага часу народныя паэты сустракаюцца надзвычай часта, яны прысутнічаюць на розных сходах, завітваюць адзін да аднаго ў госці, чытаюць вершы, іграюць у шахматы. Пры

гэтым Якуб Колас часцей за ўсё прайграваў. Цікавым з'яўляецца і той факт, што ў гэтым годзе спаўняецца 110 гадоў з моманту іх першай сустрэчы. Сапраўды юбілейны год!

Неабходна адзначыць, што Янка Купала і Якуб Колас былі вельмі розныя і як асобы, і як мастакі слова. Так, Янка Купала быў больш тэмпераментны і ўзнёслы, а вось Якуб Колас, як вядома, быў стрыманы і рэалістычны. Як кажуць, прарок і філосаф. Нават іх паэтычныя імёны гавараць аб рознасці іх творчай сутнасці. Колас – гэта зямля, праца, Купала – гэта мары аб шчасці.

Шматграннасць таленту Якуба Коласа выявілася як у паэзіі, так і ў прозе, публіцыстыцы, у дзіцячай літаратуры. Паэт піша проста і зразумела, мова яго твораў насычана народнымі моўнымі сродкамі. Неабходна адзначыць, што Якуб Колас займае адно з самых пачэсных месцаў у гісторыі беларускай дзіцячай літаратуры. Народны паэт азначыў шляхі развіцця нацыянальнай дзіцячай літаратуры, гэта былі шляхі народнасці, патрыятызму і гуманізму. Любімымі для чытачоў сталі аповесці "Дрыгва" і "На прасторах жыцця", паэмы "Новая зямля" і "Сымон-музыка".

Янка Купала – гэта паэт і драматург, аўтар цудоўных твораў: "Бандароўна", "Курган", "Магіла льва", "Паўлінка", "Раскіданае гняздо". Любоў да Радзімы і нянавісць да яе прыгнятальнікаў гучалі на ўсіх этапах яго творчасці. Паэт і вершамі, і ўласным прыкладам паказаў чытачам, што жыццё можна змяніць, калі прыкласці намаганні.

Гістарычная заслуга Янкі Купалы і Якуба Коласа заключаецца перш за ўсё ў тым, што яны стварылі сапраўдныя шэдэўры нацыянальнага мастацтва і тым самым узнялі беларускую літаратуру да ўзроўню перадавых літаратур свету. Яны па праве з'яўляюцца заснавальнікамі беларускай літаратуры і стваральнікамі беларускай літаратурнай мовы. Іх творы сёння дапамагаюць нам вытрымаць цяжкасці і пераадолець трывогі, знайсці кожнаму свой шлях у жыцці.

Я пералічу ў хаатычным ланцужку творы Янкі Купалы і Якуба Коласа. “Магіла льва”, “Дрыгва”, “Сымон-музыка”, “Казкі жыцця”, “Раскіданае гняздо”, “Паўлінка”, “Бандароўна”, “Курган”, “На ростанях”, “Новая зямля”. Падумайце: ці магчыма вызначыць галоўны твор іх жыцця? Не! Гэта зрабіць немагчыма, бо ўсе яны ўнікальныя, непадобныя, усе варты літаратурнай славы. Гэта непарыўны ланцужок.

Якуб Колас перажыў свайго сябра на 14 гадоў. Усе гэтыя гады ён будзе сумаваць і ўспамінаць свайго лепшага сябра. Аднойчы паэт напісаў, што растуць два яблыкі на адной галінцы – і не зрастаюцца. І сапраўды, так атрымалася ў паэтаў: кожны з іх – значная постаць на літаратурным небасхіле, але кожны з іх пражыў свой асобны творчы лёс. Аднак такія розныя Янка Купала і Якуб Колас здолелі ў адзін голас сказаць сваім сучаснікам і нашчадкам праўдзівае слова пра сваю краіну, яе мінулае, нацыянальны характар беларусаў. У гэтым і заключаецца іх вялікая гістарычная заслуга.